УДК [766:655.533 (477)] : 75.04 (476) “16/17”

Галіна ФЛІКОП
(Мінск)

# Гравюры выданняў Чарнігаўшчыны як крыніца беларускіх абразоў XVII–XVIII стст.

На землях Чарнігаўшчыны ў XVII–XVIII стст. дзейнічалі некалькі друкарняў, выданні якіх маюць значнасць і каштоўнасць не толькі як культурная спадчына і помнікі кнігадрукавання Украіны. Гэтыя старадрукі прадстаўляюць цікавасць і для даследчыкаў, як гэта ні дзіўна, іканапісу, пры гэтым не толькі ўкраінскага, а таксама – беларускага. Справа ў тым, што мастацтвазнаўцамі яшчэ ў пачатку XX ст. было заўважана, што іканапісцы ў якасці крыніцы выкарыстоўвалі гравюры, якія, дзякуючы сваёй тыражнасці, былі шырока распаўсюджанымі і даступнымі. Звесткі пра выкарыстанне гравюр, як іканапіснага пратографа, сустракаюцца ў працах беларускіх, украінскіх, рускіх даследчыкаў [1]. Паколькі ў дадзеным артыкуле гаворка будзе весціся пра беларускі іканапіс, то найбольш важна засяродзіцца на тых працах, дзе сустракаюцца звесткі, якія датычацца менавіта яго.

Закранаючы пытанне выкарыстання гравюры ў якасці крыніцы для абраза, варта адзначыць, што дадзеная тэматыка ў айчыннай гістарыяграфіі з’яўляецца амаль не вывучанай. Тым не менш, нават на першым этапе развіцця беларускага мастацтвазнаўства (20-я гады XX ст.), падымалася пытанне выкарыстання гравюр у якасці крыніцы для твораў іканапісу. Сведчаннем гэтага з’яўляюцца публікацыі Міколы Шчакаціхіна, у якіх ён звяртае ўвагу на дадзеную з’яву. Такія звесткі аўтар прыводзіць пра абразы вылучанай ім магілёўскай іканапіснай школы, адзначаючы, што дадзеная школа яўна фарміравалася пад уздзеяннем гравюр выданняў Куцеінскай і Магілёўскай друкарняў [2]. А вось для большасці абразоў латыгаўскай царквы (віцебская іканапісная школа) М. Шчакаціхін у якасці першаўзораў называе ілюстрацыі куцеінскага “Трыфалагіёну” 1647 г. і магілёўскіх “Акафістаў” 1698 г. [3]. Пра ўплыў гравюры на сакральны жывапіс мастацтвазнавец таксама адзначае ў працы, прысвечанай творчасці Францыска Скарыны. Гэта датычыцца дрэварыту “Троіца” з пражскага выдання [4]. Безумоўна, не ўсе звесткі пра ўзаемасувязь гравюры і абраза, якія называе пачынальнік беларускага мастацтвазнаўства ў сваіх артыкулах, з’яўляюцца бездакорнымі. Тым не менш, важна тое, што яшчэ ў 20-я гады XX ст. айчынны навуковец засяроджваўся на дадзенай з’яве, якая пазней прыцягнула ўвагу навукоўцаў і атрымала развіццё на сучасным этапе. Аднак у той час далейшага развіцця тэма выкарыстання гравюр для іканапісу не атрымала ні ў самога М. Шчакаціхіна, ні ў іншых аўтараў, а зварот да яе ўзнавіўся фактычна праз паўстагоддзі.

Цікавыя для нашага разгляду звесткі ўтрымліваюцца ў альбомах, выдадзеных у 80-я гады, “Іканапіс Беларусі XV–XVIII стст.” (перавыдаваўся пазней 6 разоў), “Жывапіс Беларусі XII–XVIII стст.”, дзе даследчыца Н.Ф. Высоцкая, даючы каментары да пэўных твораў сакральнага жывапісу, часам указвае і магчымыя іканаграфічныя крыніцы – гравюры [5]. А.А. Ярашэвіч, даследуючы гісторыю пэўных абразоў, у тым ліку і ўзнікненне іх сюжэтаў, падкрэслівае, што запазычванне іканаграфіі для беларускіх тво-









Мал. 1. “Троіца”. Абраз з в. Вялікае Малешава Столінскага р-на, Брэская вобл., XVIII ст.; мал. 2. “Троіца”. Дрэварыт з кнігі “Новы Запавет” (адгорт тытульнага аркуша) (Чарнігаў: друкарня Троіца-Ільінскага манастыра, 1717); мал. 3. Маркіянавіч “Троіца (Гасціннасць Аўраама)”. Салігорскі р-н, Мінская вобл., 1761; мал. 4. “Троіца (Гасціннасць Аўраама)”. Дрэварыт з кнігі “Служ-боўнік” (Чарнігаў: друкарня Троіца-Ільінскага манастыра, 1704).

 ISSN 2078-063X













Мал. 5. Тытульны аркуш кнігі Гергарда Іаана “Багамысліе…” (Чарнігаў: друкарня Троіца-Ільінскага манастыра, 1710); мал. 6. “Нараджэнне Хрыстова”. Абраз з г. Пружаны Брэсцкай вобл., др. пал. XVII ст.; мал. 7. “Нараджэнне Хрыстова”. Дрэварыт з кнігі “Трыфалагіён” (Куцейна: друкарня манастыра, 1647); мал. 8. “Нараджэнне Хрыстова”. Дрэварыт з кнігі Максімовіча Іаана“Багародзіцэ дзеве…” (Чарнігаў: друкарня Троіца-Ільінскага манастыра, 1707)

раў (асабліва каталіцкіх) дастаткова часта ажыццяўлялася з замежных гравюр, якія, у сваю чаргу, у большасці выпадкаў з'яўляліся рэпрадукцыямі твораў жывапісу [6]. Да разглядаемай праблемы звяртаюцца і іншыя навукоўцы. У "Іканапісе Заходняга Палесся XVI–XIX стст." мастацтвазнаўцы называюць некаторыя абразы, крыніцамі для якіх, на іх думку, паслужылі гравюры з украінскіх выданняў [7]. Адпаведныя звесткі сустракаем і ў каталогах выставаў: "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII – XIX стагоддзяў", "Православная икона России, Украины, Беларуси" выдадзеныя як у папяровым, так і электронным выглядзе [8]. Акрамя даследчыкаў іканапісу да гэтай праблематыкі звярталіся і даследчыкі гравюр. В.Ф. Шматаў, адзначаючы значнасць дрэварытаў з віленскага выдання Пятра Мсціслаўца 1575 з выявамі евангелістаў, піша пра папулярнасць гэтых твораў сярод рускіх іканапісцаў, якія выкарыстоўвалі гравюры як крыніцу для стварэння вялікіх іконных выяў евангелістаў, цара Давыда [9]. Іншы прыклад датычыцца папулярнага з XVII стагоддзя сюжэта апакаліпсіса ў фрэскавым роспісе рускіх храмаў, які распаўсюдзіўся там дзякуючы запазычаным іканаграфічным узорам [10]. Звесткі пра ўплыў гравюр на іканапіс падае і даследчыца магілёўскай друкарні А.М. Пікулік [11].

Абагульняючы вышэй сказанае, трэба падкрэсліць, што ў працах мастацтвазнаўцаў сустракаюцца (часцей за ўсё – вельмі сціслыя) звесткі пра ўплыў гравюр на беларускі іканапіс. Збольшага, у такіх выпадках вядзецца гаворка пра ўздзеянне на абразы ілюстрацый кіеўскіх выданняў (як правіла, "Акафістаў штодзённых", 1677) і ўзгаданага вышэй куцеінскага "Трыфалагіёну" (1647). Аднак няма ніводнага вядомага нам даследавання, дзе ў дадзеным кантэксце разглядаліся б ілюстрацыі чарнігаўскіх выданняў і іх роля ў развіцці беларускага іканапіснага мастацтва. А між тым, такая з'ява мае месца ў айчыннай культуры і патрабуе асобнага вывучэння.

Як было адзначана на самым пачатку дадзенага артыкула, у XVII–XVIII стст. на землях Чарнігаўшчыны дзейнічала некалькі друкарняў. Самая першая з іх, заснаваная ў Чарнігаве, працавала там непрацяглы час і пакінула вельмі сціплую спадчыну. Гэта датычыцца друкарні Кірылы Транквіліёна Стаўравецкага, які ў 1626 г. стаў архімандрытам чарнігаўскага Елецкага манастыра, куды і перавёз свой кнігавыдавецкі рыштунак. Але там друкарня фактычна 20 гадоў была бяздзейснай, і толькі напярэдадні сваёй смерці ў 1646 г. Стаўравецкі выдаў апошнюю сваю кнігу "Перла Шматкаштоўнае" [12]. Але ў гэтым жа годдзе архімандрыт неўзабаве памёр і друкарня зусім заняпала. Далейшы яе лёс не вядомы [13]. Такім чынам, Чарнігаў ды і ўся Левабярэжная Украіна засталіся без друкарні на наступныя 25 год, пакуль не была заснавана новая ў пачатку 70-х гадоў XVII ст. архіепіскапам чарнігаўскім Лазарам Барановічам пры Спаса-Праабражэнскім манастыры ў Ноўгарадзе Северскім [14]. Камплектаванне друкарні скончылася ў 1674 г. і ўжо на пачатку наступнага года былі выдадзены асобнымі брашурамі пропаведзі Л. Барановіча: "Слова на Дабравешчанне", "Слова на св. Троіцу" і "Слова на Уваскрэсенне" [15]. Але друкарня праіснавала тут нядоўга: у 1679 яна была перанесена ў Чарнігаў, дзе першапачаткова існавала пры архіепіскапскай кафедры, а пазней, пасля смерці Лазара Барановіча ў 1693, – пры Троіца-Ільінскім манастыры. Як адзначаюць навукоўцы, чарнігаўская друкарня працавала на карысць украінскай культуры да 1720, пакуль загады Пятра I і Сіноду не прымусілі яе выдаваць кнігі выключна па ўзору маскоўскіх. Акрамя іх друкарня нічога не выпускала, такой яна і перайшла ў XIX ст. [16].

 ISSN 2078-063X

Акрамя названых у разглядаемы перыяд на землях Чарнігаўшчыны дзейнічалі і іншыя друкарні. Так, у 1797 г. у Чарнігаве была заснавана "грамадзянская" друкарня, якая належала губернскаму кіраўніцтву і выдавала выключна свае распараджэнне [17]. Натуральна, што выдавецкая спадчына гэтай друкарні нашага разгляду не датычыцца. Таксама не будзе разглядацца ў дадзеным артыкуле дзейнасць друкарні ў Клінцах, якая паўстала там у 1781 г. [18]. Гэта звязана з тым, што яе выданні былі прызначаны выключна для стараабраднікаў, у асяроддзі якіх і распаўсюджваліся, а таму іх выявы і не займелі ўплыву на беларускі іканапіс (магчыма, толькі на стараабрадніцкі, але гэта патрабуе асобнага вывучэння).

Такім чынам, у дадзеным артыкуле будзе разглядацца выдавецкая і мастацкая спадчына ноўгарад-северскай друкарні Лазара Барановіча і яе спадкаемцы – чарнігаўскай друкарні Троіца-Ільінскага манастыра. Даследчыкі адзначаюць, што "Чернігівські видання мало помітні своєю зовнішністю; гравюри звичайно прості, хоч часом і тут бачимо тонку роботу, як напр. в Анфологіоні (Новгород-Сіверськім) 1678 р." [19]. Магчыма гэтая "прастата", якую адзначаюць навукоўцы, акурат і абумовіла зварот беларускіх іканапісцаў да ілюстрацый чарнігаўскіх выданняў як да першакрыніцы. На жаль, на дадзены момант такіх прыкладаў удалося выявіць не шмат. Тым не менш, усе яны заслугоўваць самай пільнай увагі.

Як было адзначана вышэй, у працах даследчыкаў нам не ўдалося выявіць звестак пра ўплыў гравюры чарнігаўскіх выданняў на беларускі іканапіс. Такіх прыкладаў мастацтвазнаўцы не прыводзяць. Аднак у кнізе "Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст." навукоўцы называюць ілюстрацыі некалькіх чарнігаўскіх старадрукаў як іканаграфічныя аналогіі [20]. Безумоўна, тут гаворка не вядзецца пра непасрэднае ўздзеянне гэтых твораў тыражнай графікі на беларускія абразы. Аднак гэтыя звескі заслугоўваюць увагі.

Гэта датычыцца абраза "Троіца" з в. Вялікае Малешава Столінскага р-на Брэсцкай вобл. (мал. 1). У навуковай літаратуры агульна прынятым для твора з'яўляецца датаванне другой чвэрцю XVIII стагоддзя. Дата была прапанавана Н.Ф. Высоцкай на падставе меркавання, што крыніцай для дадзенага абраза паслужыла гравюра з кіеўскага выдання 1724, пры гэтым назва кнігі не пазначаецца [21]. Акрамя таго, даследчыца называе аналогіі з іншых кірылічных выданняў: "Іканаграфічная схема створана яўна пад уплывам гравюры. Аб гэтым сведчыць надпіс на кляйме і благаслаўляючыя левай рукой анёлы. Абраз выкананы пасля аднасюжэтных гравюр – віленскай (1628), кіеўскай (1674). Адлюстраванне будынка, калоны з капітэллю, Аўраама і Сары, якія выходзяць з дому, размяшчэнне вакол прастола анёлаў, мамурыйскага дуба ў кіеўскай гравюры (1724) і ў абразе з с. В. Малышава люстрана супадаюць, што і дазваляе лічыць абраз створаным незадоўга пасля 1724 г., г. зн. у другой чвэрці XVIII стагоддзя" [22]. Спіс кампазіцыйных аналогій да "Троіцы" аўтары кнігі "Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст." прапанавалі дапоўніць гравюрамі чарнігаўскіх выданняў 1745 і 1759 гадоў, не пазначаючы пры гэтым іх назвы [23]. Гэтае ўзгадванне старадрукаў чарнігаўскай друкарні і з'яўляецца адзіным вядомым нам, дзе, аднак, гаворка вядзецца не пра непасрэдны ўплыў гравюр на іканапіс, а пра іканаграфічныя аналогіі. Натуральна, што высветліць, якія канкрэтна кнігі маюцца на ўвазе, прадстаўляецца досыць складаным. Аднак з дапамогай каталогаў, у якіх сістэматызаваны звесткі па старадруках, магчыма усё ж акрэсліць кола тых кніг, якія былі выдадзены ў Вільні, Кіеве і Ча-

рнігаве ў названыя вышэй гады. Такім чынам, стала вядомым, што віленскім старадрукам, пра які вядзецца гаворка, з'яўляюцца "Акафісты і каноны", выдадзеныя ў Брацкай друкарні Свята-Духавага манастыра (Вільня, 1628) [24]. Што датычыцца Кіеўскага выдання 1674 г., то, паводле "Каталога старадрукаў, выдадзеных на Украіне", ім патэнцыйна могуць быць "Акафісты і мальбы", "Трубы славес прапаведных на нарачытыя дні" Барановіча Лазара, "Ірмалой" [25]. На жаль, ніводнае з гэтай кнігі у даступных нам бібліятэках пакуль выявіць не ўдалося. Затое няма складанасцяў пры высятленні кіеўскага выдання 1724 г. – ім з'яўляецца "Трыёдзь кветная" [26]. Менавіта гравюра з гэтага выдання і прадстаўляе найбольшую цікавасць, паколькі датаванне абраза праводзілася на падставе іканаграфічнай узаемасувязі апошняга з ілюстрацыяй дадзенага выдання. На жаль, папрацаваць з гэтай кнігай пакуль не давялося.

Аднак для нашага даследавання не менш цікавымі з'яўляюцца і два чарнігаўскія выданні, названыя даследчыкамі ў "Іканапісе Заходняга Палесся XVI–XIX стст.". Першае з іх датавана 1745, другое – 1759. У 1745 г. у чарнігаўскай друкарні былі выдадзены чатыры кнігі, тры з якіх з ілюстрацыйнымі гравюрамі – Анастасій "Выклад сцілы пра веру" (1745(?), адна ілюстрацыя), Пётр Магіла "Праваслаўнае спавяданне веры" (2 ілюстрацыі з дзвюх дошак), "Правіла да прычашчэння" (15 ілюстрацый з 15 дошак, дзве з іх – медзярыты) [27]. Чацвёртае – Анастасій "Пра веру" (1745(?)) утрымлівае дзве застаўкі, хутчэй за ўсё, без фігурных клеймаў. Такім чынам, адна з трох кніг маецца на ўвазе даследчыкамі заходнепалескага іканапісу, калі гаворка вядзецца пра чарнігаўскае выданне 1745 г. Узгаданае вышэй выданне 1759 г. таксама можна выявіць толькі прыблізна: у названым годдзе выйшлі тры кнігі. "Служба … Святому Міколу" змешчае толькі адну фігурную гравюру (выява Св. Міколы), а "Новы Запавет" (11 ілюстрацый з 11 дошак) і "Псалтыр" (дзве ілюстрацыі з двух дошак) з'яўляюцца патэнцыйна магчымымі выданнямі [28]. Сітуацыя з чарнігаўскімі кнігамі такая ж, як і з названымі вышэй кіеўскімі – у асноўных бібліятэках Беларусі яны не прадстаўлены. Таму пакуль мы не маем магчымасці пацвердзіць або абвергнуць меркаванні даследчыкаў, аднак мы маем магчымасць выказаць сваю ўласную думку на гэты конт.

Навукоўцаў больш за ўсё прываблівала незвычайная іканаграфія "Троіцы" з Вялікага Малешава, якая з'яўляецца быццам бы люстэркавай адносна агульнапрынятай іканаграфіі такога сюжэту [29]. Не засталіся без увагі даследчыкаў і анёлы, якія благаслаўляюць левай рукой, наконт чаго аўтарамі выказваліся розныя версіі і меркаванні [30]. На нашу думку, Н.Ф. Высоцкая сапраўды мае рацыю, калі гаворыць, што крыніцай для абраза паслужыла гравюра. Аднак мы не можам пагадзіцца з тым, што іканапісец выкарыстоўваў першаўзор люстэркава. Іншая справа, што сама гравюра магла быць выканана памылкова. Гэта выглядае цалкам магчымым: майстар на гравіравальную дошку мог нанесці малюнак без уліку таго, што на адбітку атрымаецца люстэркавая выява. Такая гравюра і магла быць выкарыстана ў якасці крыніцы для абраза. У дадзеным выпадку наша задача заключалася ў выяўленні першаўзору для іканапіснага твора. Ім аказаўся дрэварыт з "Новага Запавету", выдадзенага ў Чарнігаве ў друкарні Троіца-Ільінскага манастыра ў 1717 годзе [31] (мал. 2). Пра выкарыстанне менавіта гэтай гравюры ў якасці ўзору сведчыць не толькі кампазіцыйная адпаведнасць і жэсты анёлаў, а і шматлікія дэталі: аркада і калона з капітэллю, постаці Аўраама і Сары (асабліва рукі Сары: правай яна прытрымлівае вопратку, у левай – нясе пачастунак

 ISSN 2078-063X

круглай формы, магчыма, булачку), абрысы лістоты мамврыкійскага дуба. Асабліва важнымі з'яўляюцца тыя дэталі, на якіх засяроджваў увагу А.А. Ярашэвіч, падкрэсліваючы, што яны нехарактэрныя для беларускага іканапісу: наяўнасць трох кубачкаў на стале (а не аднаго, як звычайна), німбы вакол галоваў Аўраама і Сары [32].

Параўнанне не пакідае сумненняў, што менавіта гравюра з чарнігаўскага выдання была выкарыстана іканапісцам як узор. Гэта не толькі дае магчымасць прасачыць, як у беларускі абраз "патрапілі" новыя рысы, а і дазваляе перагледзець датаванне, пры вызначэнні якога для даследчыкаў асноўным паказчыкам была гравюра-першаўзор. Такім чынам, ніжняя храналагічная мяжа абраза можа апусціцца на 7 гадоў: з 1724 г. (як меркавала Н.Ф. Высоцкая) на 1717 г. Гэта не вялікая розніца, аднак агульнапрынятая дата – другая чвэрць XVIII стагоддзя – у такім выпадку выглядае памылковай, бо абраз мог быць створаны і ў першую чвэрць XVIII стагоддзя (да 1725 г.).

Разгледжаны прыклад з'яўляецца адзіным, дзе, сапраўды, з вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць пра ўплыў гравюры чарнігаўскага выдання на беларускі іканапіс. Аднак ёсць не менш цікавыя іншыя прыклады, дзе, аднак, крыніцай абраза маглі паслужыць як чарнігаўскія, так і кіеўскія творы тыражнай графікі. Гэта датычыцца "Успення" з Міхайлаўскай царквы сяла Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці і яго першаўзораў. На абразе ёсць некалькі рысаў, нехарактэрных для аналагічных беларускіх твораў XVIII ст. Аднак самае незвычайнае на аброўскім "Успенні" – дзверцы, намаляваныя на ложку Маці Божай (мал. 9). Такой дэталі больш няма на адпаведных творах беларускага іканапісу. Пошукі першаўзору сярод гравюр украінскіх выданняў далі свой вынік: былі знойдзены сем кіеўскіх і два чарнігаўскіх стараддрукі, дзе сустракаецца выява з такой іканаграфіяй. Такім чынам, гравюра "Успенне з "дзверцамі" як ілюстрацыя была надрукавана ў "Псалтыры з тлумачэннем", (Кіеў, 1697) [33], "Малітваслове" (Кіеў, 1751-1755(?)) [34], "Малітваслове" (Чарнігаў, 1747) [35] (мал. 10); як кляймо на тытульным аркушы ў "Новым Запавеце" (Кіеў, 1703) [36], "Мінеі" (Кіеў, 1750) [37], "Патэрыку Кіева-Пячорскім" (Кіеў, 1760) [38], "Патэрыку Пячорскім" (Кіеў, 1783) [39], кнізе Гергарда Іаана "Б[о]гомыслие в ползу правоверним" (Чарнігаў, 1710) [40] (мал. 5), як кляймо застаўкі ў "Часаслове (Кіеў, 1729) [41]. З прыведзенага пераліку відавочна, што незвычайная выява стала сюжэтам не толькі ілюстрацыйных гравюр, але і друкавалася ў застаўках, а таксама, што найбольш важна, на тытульных аркушах. Адсюль робіцца зразумелым, што з'яўленне такой іканаграфіі не было выпадковым. І, сапраўды, нам удалося выявіць яе вытокі. Друкаванне дадзенага сюжэту на тытуле тлумачыцца тым, што абраз "Успенне" быў напрастольным абразом галоўнага храма Кіева-Пячэрскай Лаўры, адкуль і паходзіць назва апошняга "Успенскі", а таксама дадзенае найменне выкарыстоўваецца ў разгорнутай назве Лаўры: Кіева-Пячэрская Успенская. Натуральна, што самы шанаваны абраз не быў пакінуты без увагі майстроў кніжнай справы. А недзе, паводле нашага меркавання, ў канцы XVII ст. у Лаўры з'яўляецца абраз "Успенне" з машчавікам: прыробленыя да іконы срэбныя дзверцы за якімі захоўваліся частачкі мошчаў святых [42] (мал. 11). Менавіта гэты абраз фактычна і рэпрадукаваўся на гравюрах кіеўскіх выданняў. А чарнігаўскія майстры кніжнай справы, па ўсёй верагоднасці, яго проста адтуль скапіравалі для сваіх кніг.

На дадзены момант не прадстаўляецца магчымым высветліць, з якой менавіта кнігі была выкарыстана выява пры стварэнні іканапісцам аброўскага абраза. У дадзеным вы-

Мал. 10. “Успенне”. Дрэварыт з кнігі “Малітв
(Чарнігаў: друкарня Троіца-Ільінскага манастыра



Мал. 11. “Успенне Кіева-Пячорскае”.
Абраз з машчавікам. Кіева-Пячэрская Лаўра,
др. пал. XVII ст.





Мал. 9. “Успенне”. Абраз з в. Аброва Івацэвіцкага р-на, Брэсцкая вобл., XVIII ст.

 ISSN 2078-063X

падку ў роўнай ступені на беларускі іканапіс маглі паўплываць і кіеўскія, і чарнігаўскія творы тыражнай графікі. Тым не менш, гэта – цікавы прыклад уплыву гравюр на іканапіс, які суправаджаецца з'яўленнем на апошнім незвычайных, на першы погляд незразумелых, рысаў.

Таксама варта назваць і некалькі прыкладаў, калі дрэварыты чарнігаўскіх выданняў з'яўляюцца вельмі набліжанымі іканаграфічнымі аналагамі. Гэта датычыцца пружанскага абраза "Нараджэнне Хрыстова" і аднайменнай гравюры з кнігі Іаана Максімовіча "Багародзіцэ дзеве кніга нарачона…" (Чарнігаў, 1707). Н.Ф. Высоцкая ў якасці крыніцы для названага твору іканапісу называе іншую гравюру – выяву з куцеінскага "Трыфалагіёну" – і, магчыма, паводле яе праводзіць датаванне абраза: "Популярен среди белорусских изографов был Кутейнский "Трефологион" (1647). Гравюра "Рождество Христово", помещённая в нём, послужила кужбушком для односюжетной иконы середины 17 в. из Пружан" [43]. Безумоўна, на абразе і на куцеінскім дрэварыце ёсць агульныя рысы: размяшчэнне фігур, анёлы ў аблоках. Аднак і адрозненні таксама відавочныя: на дрэварыце (як і на большасці адпаведных твораў) сюжэт разгортваецца на фоне будынка, а на абразе – на фоне пячоры (мал. 6–7). Такая ж дэталь (пячора на заднім плане) сустракаецца на некаторых гравюрах з украінскіх выданняў. Найбольш блізкай іканаграфічнай аналогіяй з'яўляецца ілюстрацыя кнігі І. Максімовіча "Багародзіцэ…" (Чарнігаў, 1707) [44] (мал. 8). Агульнасць абраза і чарнігаўскай выявы назіраецца не толькі ў агульнай кампазіцыі, размяшчэнні пячоры, анёлаў у аблоках. А таксама і ў кампаноўцы галоўных персанажаў: Марыі, Іосіфа, немаўля. Асабліва падабенства назіраецца ў постаці Марыі, яе жэстах, складках вопраткі. Аднак ёсць і адрозненні названых твораў, што не дазваляе сцвярджаць пра ўплыў менавіта гэтай гравюры на ікону. Пры гэтым трэба адзначыць, што даты стварэння абраза і дрэварыту не з'яўляюцца першаснымі фактарамі для абвяржэння думкі пра іх іканаграфічную сувязь. Інакш кажучы, тое, што абраз датаваны другой паловай XVII ст., а дрэварыт размешчаны ў кнізе, якая выйшла пазней (1707) амаль ні пра што не гаворыць. Справа ў тым, што, магчыма абраз быў датаваны даследчыцай паводле выяўленага ёй магчымага першаўзору – ілюстрацыі да куцеінскага "Трыфалагіну", аднак падабенства гэтых твораў адноснае. Таму, калі датаванне праводзілася менавіта праз гэта, то яно можа быць неадакладным. Акрамя таго, тое, што названае намі чарнігаўскае выданне выйшла на пачатку XVIII ст. не дае звестак пра дату стварэння гравюры. Яна магла быць выразана і адціснута і ў іншым, больш раннім выданні, якое намі пакуль не выяўлена.

Да абраза "Троіца старазапаветная" слуцкага майстра Маркіянавіча (мал. 3), які навучаўся іканапісу ў майстэрні Кіева-Пячэрскай Лаўры, найбольш блізкай з'яўляецца выява з чарнігаўскага "Службоўніка" 1704 г. [45]. Натуральна, тут сцвярджаць пра непасрэдную іканаграфічную ўзаемасувязь твораў не выпадае. Аднак названая гравюра з усіх вядомых нам украінскіх і беларускіх твораў тыражнай графікі таго часу з'яўляецца, сапраўды, самай набліжанай да абраза Маркіянавіча (мал. 4). Кажучы пра іканаграфічныя аналогіі, варта таксама ўзгадаць выявы з клеймаў заставак "Мінеі", выдадзенай у ноўгарад-северскай друкарні Лазара Барановіча ў 1678 г., якія вельмі нагадваюць некаторыя абразы шарашоўскага іканастаса (XVIII ст., Пружанскі р-н Брэсцкай вобл.) [46]. Аднак у гэтым выпадку, як і ў папярэднім, казаць пра непасрэднае ўздзеянне адзначаных гравюр на творы сакральнага жывапісу не выпадае. Тым не

менш, цалкам верагодна, што для шарашоўскіх ікон крыніцамі паслужылі гравюры XVII стагоддзя. Выказаць такое меркаванне дазваляе стылістыка твораў: "Майстры, якія працавалі над яго (іканастаса) стварэннем, верагодна, ў 60-70-я гады XVIII ст., выказваюць надзвычай паслядоўную прыхільнасць традыцыйнаму канону мясцовай праваслаўнай іканаграфіі XVII ст. Пачынаючы ад агульнай кампазіцыйнай структуры іканастаса і заканчваючы асобнымі дэталямі кампазіцыі святочных абразоў – усё падпарадкавана мэце захавання "старыны" [47]. Магчыма, "захаванне старыны" не было мэтай, а атрымалася само сабой, дзякуючы выкарыстанню крыніцаў XVII ст. Увогуле, Шарашоўскі іканастас яшчэ чакае свайго вывучэння, якое можа даць адказы на шматлікія пытанні адносна гэтага цікавага самабытнага помніка.

Абагульняючы вышэй сказанае, трэба яшчэ раз падкрэсліць, што гэтая тэма на дадзены момант амаль не атрымала асвятлення, а тым больш – грунтоўнага вывучэння, у навуковай літаратуры. Прыведзеныя вышэй прыклады ўздзеяння чарнігаўскіх твораў тыражнай графікі на беларускі іканапіс – перш крок у даследаванні заяўленай праблемы. Безумоўна, пэўныя аспекты не былі закрануты, некаторыя пытанні засталіся па-за ўвагай, а выяўленыя намі нешматкія прыклады не дазваляюць зрабіць грунтоўныя абагульнні і адназначныя высновы па дадзенай культурна-мастацкай з'яве. Тым не менш, атрыманыя звесткі з'яўляюцца надзейным падмуркам для далейшага даследавання і вывучэння тэмы на новым узроўні. Іканаграфічная ўзаемасувязь беларускіх абразоў і гравюр выданняў Чарнігаўшчыны, безумоўна, з'яўляецца цікавай старонкай як беларускай, так і ўкраінскай культуры.

**Крыніцы і літаратура**


1. *Флікоп Г.А.* Гравюра як іканаграфічная крыніца іканапісу: асноўныя аспекты вывучэння ў беларускай, украінскай, рускай гістарыяграфіях / Г.А. Флікоп // Церква – наука – суспільство: питання взаємодії. Матеріали Восьмої Міжнародної наукової конференції (26–28 травня 2010 р.); Нац. Києво-Печер. іст.-культ. заповідник. – К.: НКПІКЗ, 2010. – С. 50–52.
2. 1-я ўсебеларуская мастацкая выстаўка: Каталог аддзела старажытнага мастацтва / Апрац. М. Шчэкаціхіна. – Мінск, 1926. – С. 11.
3. Там жа. – С. 17–19. *Шчакаціхін М.* Васіль Вашчанка – магілёўскі гравёр канца XVII – пач. XVIII сталецьця / М. Шчакаціхін // Адбітак з Навуковага Зборніку Інстытуту Беларускае Культуры. – Мінск, 1925. – С. 129–130.
4. *Шчакаціхін М.* Гравюры і кніжныя аздобы ў выданьнях Францішка Скарыны / М. Шчакаціхін; Ін-т беларускай культуры. – Мінск, 1926. – С. 32.
5. Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 1980. – С. 7–8; Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 2001. – № 6, 16, 20, 40, 41, 44, 50, 52, 65, 75, 97, 102, 119.
6. *Ярашэвіч А.* "Маці Божая Снежная" ў Беларусі / А. Ярашэвіч. – Мінск: Выд-ва "Про Хрысто", 2003. – С. 11, № 20, 21, 23, 31, 32.
7. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / В.Ф. Шматаў, Э.І. Вецер, М.П. Мельнікаў і інш.; навук. рэд. В.Ф. Шматаў; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К. Крапівы НАН Беларусі. – Мінск: Бел. навука, 2002. – С. 180, 190.
8. Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў: віртуальная версія выставы "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў" у Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага [Электронны рэсурс]. – [Мінск, 2009]. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM); 12 см. – Сістэм. патраб: Pentium; 32 Mb RAM; CD-ROM Windows 98/2000/NT/XP. – Назва з тытул. экрана; Православная икона России, Украины, Беларуси: виртуальная версия выставки "Православная икона России, Украины, Беларуси" в Национальном художественном музее 30 сентября – 9 ноября 2008 г. [Электронны рэ-

сурс]. – [Мінск, 2009]. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM); 12 см. – Сістэм. патраб: Pentium; 32 Mb RAM; CD-ROM Windows 98/2000/NT/XP. – Назва з тытул. экрана.
9. *Шматаў В.Ф.* Гравёрная школа Пятра Мсціслаўца / В.Ф. Шматаў // Мастацтва Беларусі. – 1984. – № 1. – С. 11.
10. *Шматаў В.Ф.* Абодва перамаглі / В.Ф. Шматаў // Мастацтва Беларусі. – 1990. – № 9. – С. 14.
11. *Пікулік А.М.* Мастацтва магілёўскіх старадрукаў / А.М. Пікулік. – Минск: УП "Тэхнапрынт", 2002. – С. 80.
12. *Огієнко І.І.* Історія українського друкарства [Электронны рэсурс] // Ізборник [ваб-сайт]. – [24.11.2009]. – Режим доступу: http://litopys.org.ua/ohdruk/ohd.htm. – Назва з экрана (24.11.2009).
13. Там жа.
14. Там жа.
15. *Ісаєвич Я.* Українське книговидання: витоки, розвиток, проблеми [Электронны рэсурс] // Ізборник [вэб-сайт]. – [24.11.2009]. – Рэжым доступу: http://izbornyk.org.ua/isaevych/is.htm. – Назва з экрана (24.11.2009). *Огієнко І. І.* Указаная праца.
16. *Огієнко І. І.* Указаная праца.
17. Там жа.
18. Там жа.
19. Там жа.
20. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст.… – С. 180.
21. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / Аўтар тэксту і складальнік Н.Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 2001. – № 75. *Высоцкая Н. Ф.* Искусство Беларуси XII–XVIII вв. / Н. Ф. Высоцкая. – Минск, 2004. – С. 18.
22. Там жа.
23. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст.… – С. 180.
24. Кніга Беларусі. 1517–1917: зводны каталог / Дзярж. б-ка БССР імя У.І Леніна, БелСЭ; склад. Г.Я Галенчанка [і інш.] – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 99-100.
25. *Запаско Я. П. Ісаєвич Я. Д.* Памятки книжкового мистецтва: Каталог стародруків, виданих на Україні. Книга 1 (1574–1700) / Я. П. Запаско, Я. Д. Ісаєвич. – Львів: Вища школа. Вид-во при Львівському Державному Університеті, 1981. – С. 89-90.
26. *Запаско Я. П. Ісаєвич Я. Д.* Памятки книжкового мистецтва: Каталог стародруків, виданих на Україні. Книга 2. Частина 1 (1701-1764) / Я. П. Запаско, Я. Д. Ісаєвич. – Львів: Вища школа, 1984. – С. 37-38.
27. Там жа. – С. 69.
28. Там жа. – С.111.
29. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў… – № 75. *Ярашэвіч А.* "І напоўніліся ўсе Духам Святым": Сюжэты Спаслання Святога Духа і Тройца ў старажытнабеларускім мастацтве [Электронны рэсурс] // Наша вера [вэб-сайт]. – [24.11.2009]. – Рэжым доступу: http://media.catholic.by/nv/n46/aboutus.htm. – Назва з экрана (24.11.2009).
30. *Флікоп Г. А.* Абраз "Троіца" з Вялікага Малышава і яго ўкраінскі дрэварыт-пратограф / Г. А. Флікоп // Історія релігій в Україні: науковий щорічник / Упоряд. О. Киричук, М. Омельчук, І. Орлевич. – Львів: Львівський музей історіі релігіі, вид-во "Логос", 2010. – Книга 2. – С. 851–859.
31. Новый Завет си есть, Ев[анге]лие, или Бл[а]говествование Г[о]с[по]да Б[о]га и Сп[а]са нашего Ии[су]са Хр[и]ста . - Чернигов : в Типографии с[вя]то Тро[и]цкой, 1717. – 548 с.
32. *Ярашэвіч А.* Указаная праца.
33. Псалтырь с толкованием. – Киев: тип. Киево-Печерской Лавры, 1697. – 381 с.
34. Молитвослов. – Киев: тип. Киево-Печерской Лавры, 1751–1755. – 541 с.
35. Молитвослов. – Чернигов : в Типографии с[вя]то Тро[и]цкой, 1747.
36. *Запаско Я. П. Ісаєвич Я. Д.* Памятки книжкового мистецтва: Каталог стародруків, виданих на Україні. Книга 2… – С. 28.
37. Минея, месяц июль. – Киев: тип. Киево-Печерской Лавры, 1750. – 181 с.
38. *Запаско Я. П. Ісаєвич Я. Д.* Памятки книжкового мистецтва: Каталог стародруків, виданих на Україні. Книга 2… – С. 118. Патэрык Кіева-Пячорскі. – Кіеў: друкарня Кіева-Пячэрскай Лаўры, 1760. – 142 с.
39. Патерик Печерский. – Киев: тип. Киево-Печерской Лавры, 1783. – 164 с.

40. *Гергард И.* Б[о]гомыслие в ползу правоверним / Иоанн Гергард. – Чернигов: в типографе[и] с[вя]то Троецкой Илинской, 1710. – 361 с.
41. Часослов. – Киев: тип. Киево-Печерской Лавры, 1729. – 520 с.
42. Православная икона России, Украины, Беларуси: виртуальная версия выставки "Православная икона России, Украины, Беларуси" в Национальном художественном музее 30 сентября – 9 ноября 2008 г. [электронный ресурс]. – [Мінск, 2009]. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM); 12 см. – Сістэм. патраб: Pentium; 32 Mb RAM; CD-ROM Windows 98/2000/NT/XP. – Назва з тытул. экрана.
43. *Высоцкая Н.Ф.* Указаная праца; Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў… – № 48.
44. *Максимович Иоанн.* Б[огороди]це Д[е]во. Книга нареченна от Троици Прес[вя]тыя пред веки сложена о[т]цем Иоанном Максимовичом. – Чернигов: в тип[ографии] С[вято]-Троец[кой] Илин[ской] Черн[еговской], 1707. – 330 с.
45. *Запаско Я. П. Ісаєвич Я. Д.* Памятки книжкового мистецтва: Каталог стародруків, виданих на Україні. Книга 2… – С. 29. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў… – № 117.
46. Минея праздничная. – Новгород-Северский: типография Лазаря Барановича, 1678; Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў… – № 93–107.
47. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст.… – С. 185–186.



***Флікоп Г.О.*** **Гравюри видань Чернігівщини як джерело білоруських ікон XVII–XVIII ст.**

У центрі уваги даної статті перебувають гравюри видань чернігівської друкарні та їх вплив на білоруський іконопис XVII–XVIII ст. У білоруській історіографії дана тема досі не розроблена, а відомості про вплив чернігівської гравюри на білоруський іконопис відсутні взагалі. У даній статті наводяться й аналізуються приклади такого іконографічного взаємозв'язку.

***Ключові слова:*** українська гравюра, білоруський іконопис, чернігівська друкарня, іконографія.

***Фликоп Г.А.*** **Гравюры изданий Черниговщины как источник белорусских икон XVII – XVIII вв.**

В центре внимания данной статьи находятся гравюры изданий черниговской типографии и их влияние на белорусскую иконопись XVII–XVIII вв. В белорусской историографии данная тема является не разработанной, а сведения о влиянии черниговской гравюры на белорусскую иконопись отсутствуют. В данной статье выявляются и анализируются примеры такой иконографической взаимосвязи.

***Ключевые слова:*** украинская гравюра, белорусская иконопись, черниговская типография, иконография.

***Flikop H.A.*** **Engravings of editions of Chernigov land as the source of Belarus icons of 17–18 centuries**

In the center of attention of given article there are engravings of editions of the Chernigov printing house and their influence on the Belarus iconography 17th–18th. In the Belarus historiography the given theme is not developed, and data on influence of the Chernigov engraving on the Belarus iconography are absent. In the article there are detected and analyzed examples of such iconographical interrelation.

***Key words:*** the Ukrainian engraving, the Belarus icon-painting, the Chernigov printing house, an iconography.


 ISSN 2078-063X